РУХ НАПЕРАД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У адказ Ільхам Аліеў падзякаваў за запрашэнне і сказаў, што вельмі рады чарговы раз пабываць на брацкай беларускай зямлі. Паводле яго слоў, частыя візіты прэзідэнтаў у абедзве краіны — гэта паказчык адносін, блізкіх і сяброўскіх сувязяў.

Прэзідэнт Азербайджана звярнуў увагу, што адносіны нашых дзяржаў вылучае той факт, што ўсё, пра што бакі дамаўляюцца, выконваецца. Ён нагадаў, што мы падтрымліваем адзін аднаго ва ўсіх міжнародных структурах, развіваецца прамысловая кааперацыя, супрацоўніцтва ў ваенна-тэхнічнай сферы, культуры і адукацыі, па ўсіх кірунках ёсць пазітыў, добры настрой і канкрэтныя вынікі.

«Мой цяперашні візіт — не толькі магчымасць абмеркаваць, што было зроблена, прааналізаваць, падвесці вынік, але і таксама намеціць шляхі далейшага супрацоўніцтва, збліжэння. Упэўнены, у гэтым кірунку мы сёння прымем важныя рашэнні», — заявіў Ільхам Аліеў.

Ён таксама запрасіў Аляксандра Лукашэнку ў Азербайджан у любы зручны час.

Адкрываем новыя магчымасці

Пасля адбыліся перагаворы ў пашыраным фармаце.

На іх Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: Беларусь настроена на сістэмнае і доўгачасовае супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай сферы. Нягледзячы на станоўчую дынаміку тавараабароту з Азербайджанам, яго аб'ёмы далёкія ад аптымальных. «Мы бачым патэнцыял для іх павелічэння», — дадаў ён.

Беларускі лідар заявіў, што дзякуючы падабенству поглядаў з Ільхамам Аліевым на развіццё эканомікі закладзена аснова для шырокай вытворчай кааперацыі. Дарэчы, годны прыклад такой работы прадэманстравалі флагманы беларускага машынабудавання — МТЗ і МАЗ разам з Гянджынскім аўтамабільным заводам. У Гянджы ўжо сабрана больш за дзесяць тысяч трактароў і тры з паловай тысячы адзінак аўтамабільнай тэхнікі.

«Сёння мы гатовыя прыступіць да прынцыпова новага этапу супрацоўніцтва — сумеснага асвойвання рынкаў трэціх краін. Некалі мы пра гэта толькі марылі. У высокай ступені гатоўнасці знаходзіцца праект выпуску трактароў у Турцыі з удзелам Мінскага і Гянджынскага заводаў. Менавіта за падобнымі ініцыятывамі будучыня, на іх трэба рабіць акцэнт», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Акрамя таго, ёсць перспектывы па такіх кірунках, як пастаўка і зборка ў Азербайджане электробусаў, ліфтаў, збожжаўборачных камбайнаў і іншай сельгастэхнікі.

Таксама Прэзідэнт звярнуў увагу на аграрную сферу: і тут неабходна пашыраць кантакты, павялічваць узаемныя пастаўкі харчавання. Беларуская малочная, мясная і рыбная прадукцыя, кандытарскія вырабы карыстаюцца попытам у азербайджанскага спажыўца.

Міжнародны гандаль — гэта дарога з двухбаковым рухам, таму ёсць зацікаўленасць у павелічэнні прысутнасці азербайджанскіх тавараў на беларускім рынку, падкрэсліў Лукашэнка.

Нядаўна ў Турцыі азербайджанскі бок пабудаваў нафтаперапрацоўчы комплекс. «Будзем рады прыходу азербайджанскіх інвестараў у Беларусь і гатовыя да сур'ёзнага ўзаемадзеяння ў стратэгічных галінах. Цяпер абмяркоўваецца магчымасць інвестыцый Дзяржнафтакампаніі Азербайджана ў мадэрнізацыю «Гродна Азота».

Паводле слоў Прэзідэнта, ёсць значны рэзерв у транспартна-лагістычнай сферы. Напрыклад, у чыгуначных зносінах, у тым ліку ў рамках стварэння міжнароднага транспартнага калідора «Поўнач — Поўдзень» і ініцыятывы «Эканамічны пояс Шаўковага шляху».

Перспектыўным ён назваў стварэнне сумесных прадпрыемстваў у фармацэўтыцы, а таксама каардынацыю намаганняў у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, навукі, культуры. «Мы настроены працягваць падрыхтоўку кадраў для Азербайджана, прытым у патрэбным для вас аб'ёме па любых спецыяльнасцях, якія вам будуць патрэбныя. У тым ліку навучанне вашых ратавальнікаў ва Універсітэце грамадзянскай абароны МНС Беларусі», — сказаў ён.

Традыцыйна цесныя і актыўныя двухбаковыя кантакты падтрымліваюцца паміж супрацоўнікамі праваахоўных структур, органаў сацыяльнай абароны, агракомплексу, сфер сувязі і інфарматызацыі. «Падрыхтаваныя да падпісання пагадненні зробяць наша супрацоўніцтва яшчэ больш эфектыўным», — дадаў беларускі лідар.

Таксама Прэзідэнт ад імя ўсёй нашай краіны падзякаваў кансультантам з Азербайджана, якія супрацоўнічаюць з Дырэкцыяй Другіх Еўрапейскіх гульняў, Міністэрству моладзі і спорту і асабіста міністру Азаду Рагімаву за прафесійную дапамогу і падтрымку ў пытаннях арганізацыі гульняў у 2019 годзе. Беларускі лідар запрасіў усіх прысутных наведаць гэтае мерапрыемства.

Пра што дамовіліся?

Апошнім этапам перагавораў прэзідэнтаў стала прыняцце сумеснай заявы, а таксама падпісанне шэрагу двухбаковых дакументаў у іх прысутнасці.

Так, згодна з заявай мае месца быць пераход на якасна новы ўзровень адносін дружбы і супрацоўніцтва, які адпавядае рэаліям XXI стагоддзя. Акрамя агульных падыходаў па знешнепалітычных пытаннях, дакумент фіксуе палажэнні эканамічнага супрацоўніцтва.

Што да двухбаковых дакументаў, то сярод іх наступныя: пагадненне ў галіне міграцыі, пагадненне аб супрацоўніцтве паміж пракуратурамі дзвюх краін, а таксама ў сферы судова-экспертнай дзейнасці.

Таксама бакі падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне сельскай гаспадаркі і харчавання і мемарандум аб узаемаразуменні ў галіне працы, занятасці і сацыяльнай абароны, мемарандум аб узаемаразуменні аб развіцці ўзаемавыгаднага двухбаковага супрацоўніцтва ў галіне паставак узбраення і тэхнікі супрацьпаветранай абароны.

Яшчэ члены дэлегацый паставілі подпісы пад пратаколам намераў аб развіцці супрацоўніцтва ў галіне сувязі і інфармацыйных тэхналогій, прынялі комплексны план мерапрыемстваў на 2019—2021 гады па рэалізацыі Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж МНС дзвюх дзяржаў.

Застаецца толькі выконваць

Ператварыць намеры ў справы дапаможа рэалізацыя дасягнутых дамоўленасцяў — пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з прадстаўнікамі СМІ па выніках перагавораў.

Паводле яго слоў, падчас перамоў асноўная ўвага аддавалася паспяховаму гандлёва-эканамічнаму і інвестыцыйнаму супрацоўніцтву. «Дасягнуты дамоўленасці, якія будуць дадатковым імпульсам для яго нарошчвання», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Беларусь зацікаўлена ў азербайджанскіх інвестыцыях і высокаякаснай прадукцыі, дадаў Аляксандр Лукашэнка. Нагадаем, сёння тавары з гэтай краіны шырока прадстаўлены ў Гандлёвым доме Азербайджана, які адкрыўся летась у Мінску. «Адзначу, што яны карыстаюцца папулярнасцю ў беларускіх пакупнікоў. Таму Прэзідэнт Азербайджана прыняў рашэнне аб пашырэнні гэтай сеткі ў абласныя цэнтры», — сказаў кіраўнік Беларусі.

«Шмат што можна зрабіць разам і ў транспартна-лагістычнай сферы. Мы гатовыя ўдзельнічаць у інфраструктурных праектах у Азербайджане: будаўніцтве новых чыгунак, марскіх партоў, лагістычных цэнтраў, — пералічыў беларускі лідар. — Ёсць рэзервы супрацоўніцтва ў ахове здароўя, адукацыі, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях, спорце і турызме».

Так, напрыклад, ужо вядзецца работа па стварэнні ў Азербайджане сумеснага прадпрыемства па выпуску беларускіх лекаў. «Абсалютна перакананы — не за гарамі рэалізацыя і іншых маштабных і цікавых праектаў», — дадаў ён.

«Беларусь і Азербайджан назаўжды застануцца надзейнымі і стратэгічнымі партнёрамі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Перакананы, што традыцыйна плённае супрацоўніцтва, узаемная падтрымка будуць і надалей адметнай рысай беларуска-азербайджанскіх адносін».

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

СВЯТА КАРАВАЯ

Дажынкі-2018

Фота Міхаіла ЛАПІНА.

Сёлета сталіцай абласных «Дажынак» на Гродзеншчыне стаў горад Іўе. Падчас падрыхтоўкі населены пункт стаў больш прывабны, тут з'явіліся новыя аб'екты. Адзін з іх — скульптурны парк — стварылі ўсе раёны вобласці, як, дарэчы, і агульны каравай. Ён атрымаўся важкі — ажно 30 кілаграмаў. Таксама кожны раён прадэманстраваў свае ўнікальныя рысы і дасягненні ў сферы АПК. Найлепшых ушанавалі ва ўрачыстай абстаноўцы.

Адным з самых яскравых момантаў свята стала шэсце найлепшых аграрыяў Гродзеншчыны. Іх працу сімвалізаваў важкі каравай, за якім рухалася ўся вялікая калона прадстаўнікоў 17 раёнаў вобласці. На фестывалі згадалі і даўнюю традыцыю — услаўляць завяршэнне земляробчага года абрадамі ў гонар Багача. На кірмашы ён быў прадстаўлены ў выглядзе трохметровага кошыка, які напоўнілі збожжам прадстаўнікі дэлегацый рэгіёна. Дажыначны каравай прыняў ад гаспадароў свята **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.** Ён адзначыў, што аграрыі поўнасцю ўбралі ўсё з палёў і з годнасцю вытрымалі экзамен, які ім «арганізавала» надвор'е.

— Мы не толькі забяспечылі нашу харчовую бяспеку, але і заклалі аснову для будучага ўраджаю, — падкрэсліў губернатар. — Нам даводзіцца працаваць у зоне рызыкоўнага земляробства, таму павінны быць гатовы да такіх кліматычных перападаў. Зараз важна разлічваць на новыя, інавацыйныя тэхналогіі і правільна іх выкарыстоўваць. Спецыялістаў у аграрнай галіне Гродзеншчыны дастаткова.

Дарэчы, у сельскай гаспадарцы працуе кожны трэці з занятых у эканоміцы рэгіёна. Работнікі АПК забяспечваюць 15 % валавога рэгіянальнага прадукту, а з улікам занятых у перапрацоўцы — каля 40 %.

Сёлета ў вобласці намалацілі 1 мільён 150 тысяч тон збожжавых і зернебабовых. У пяці гаспадарках ураджайнасць перавысіла 65 цэнтнераў з гектара. Найлепшым у абласным спаборніцтве на ўборцы стаў Гродзенскі раён. Ён таксама выйшаў у лідары і ў галіне жывёлагадоўлі.

— Тая частка каравая, якую Гродзеншчына прынесла краіне, сведчыць, што хлебаробы спрацавалі на высокім узроўні, — адзначыў **намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар БРЫЛА.** — Такія раёны, як Гродзенскі, Карэліцкі, Шчучынскі, займаюць лідзіруючыя пазіцыі ў краіне. Гродзенцы змаглі ўтрымаць станоўчую дынаміку па вытворчасці малака і мяса. На 255 новых малочнатаварных фермах вырабляецца 77 % малака — гэта самы высокі паказчык у краіне.

Падарункам раёну з рук **міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя ХУДЫКА** сталі два электрамабілі, якія закуплены ў рамках праекта праграмы Глабальнага экалагічнага фонду па скарачэнні выкідаў парніковых газаў. Транспартныя сродкі перададуць раённай бальніцы і цэнтру сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. У раёне ёсць і першая зарадная станцыя, якая паклала пачатак стварэнню інфраструктуры для запраўкі электрычнага транспарту ў раёне.

І гэта далёка не ўсе прыемныя моманты для раёна, які сёлета стаў сталіцай абласных «Дажынак». Значныя змены адбыліся ў самім вобліку горада. Толькі аднаго плота адрамантавана і заменена больш за 20 кіламетраў. Добраўпарадкавана амаль 30 кіламетраў вуліц. Адноўлены фасады амаль 300 індывідуальных жылых дамоў і 120 аб'ектаў, у тым ліку Дома культуры. Уведзены новы школьны стадыён, на будаўніцтва якога было выдаткавана 640 тысяч рублёў. На ім, дарэчы, увесь фестывальны дзень праходзіла культурна-спартыўная «Сельская эстафета». Яшчэ 425 тысяч рублёў накіравалі на капітальны рамонт Іўеўскай сярэдняй школы. Таксама быў адноўлены мост цераз рэчку Іўянку, а на ўзбярэжжы з'явілася каля 20 скульптур. Гэта — падарунак гаспадарам «Дажынак» ад кожнага раёна. Тут з'явіліся скульптуры ў выглядзе залатой рыбкі, русалкі, вялізнага сома, уладара падводнага царства і многіх іншых, аб'яднаных воднай тэматыкай.

Адноўлены гарадскі сквер закаханых. Тут усталявана лаўка ў выглядзе сэрца і «вырасла» каванае дрэва. Першы замочак на ім пакінула сям'я маладых спецыялістаў Вікторыі і Дзмітрыя Куцеляў, для якіх гэта свята стала яшчэ і асабістым — яны пажаніліся і атрымалі віншаванне ад гарадскіх і абласных улад, а ў якасці падарунка — сертыфікат на арэндную кватэру ў новай шматпавярхоўцы.

Дарэчы, нагадаў для весялосці хапала ўсім, хто прыйшоў на цэнтральную плошчу Іўя. З усіх бакоў чуваць было спевы, вясёлыя заклікі гаспадароў падворкаў. Імправізаваную сельскагаспадарчую выстаўку дасягненняў прадставіў кожны раён Гродзеншчыны. Напрыклад, Іўе вядома як край памідораў. Іх тут пачалі вырошчваць пяць стагоддзяў таму, калі ў гэтых мясцінах пасяліліся татары. І зараз на Іўеўшчыне агародніцтва шырока распаўсюджана.

Гаспадыняй Астравецкага падворка стала кукуруза. Гасцей частавалі пірагамі па мясцовых рэцэптах. А ашмянцы зрабілі дзівосную інсталяцыю з батонаў у выглядзе двухметровага коласа. Гаспадары прапанавалі змалоць збожжа як у старажытнасці ці зляпіць з салёнага цеста фігурку. Была тут і малочная краіна, і мядовая, і яблычная, і бульбяная... Усё, чым славіцца Гродзеншчына. А для наведвальнікаў «смачныя» кампазіцыі сталі каларытнымі фотазонамі.

Добрым сюрпрызам для сельскіх працаўнікоў стала выстаўка тэхнікі МТЗ. Тут можна было ўбачыць і трактар года, які стаў найлепшым на спецыялізаванай выстаўцы ў Расіі і нават атрымаў тытул «Містар трактар». Дарэчы, яскравае свята доўжылася ўвесь дзень. На пляцоўках выступілі творчыя калектывы з усіх раёнаў Гродзеншчыны, абласной філармоніі. Аграрыяў рэгіёна павіншавалі і вядомыя беларускія артысты. На кірмашы выступілі ансамблі «Песняры» і «Дразды».

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Путем проведения повторного открытого аукциона реализуется незавершенное законсервированное капитальное строение (здание неустановленного назначения) (публикация извещения в газете «Звязда» 19.09.2018 г.).
Инвентарный номер 334/U-11194, общая площадь 8 258 кв. м, объект расположен по адресу: Гомельская обл., Лельчицкий р-н, г. п. Лельчицы, ул. Меньшикова, 75Б. **Готовность строения – 65 %.**
Земельный участок общ. пл. 1,7776 га предоставлен на праве аренды до 23.10.2037 г.
Начальная цена с НДС 20 % – 162 000 долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты)**. С учетом понижения цены на 10 %.**
Дата и время проведения аукциона: 28.11.2018 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». Заявления принимаются до 26.11.2018 до 17.00 по тому же адресу.
Подробная информация на сайте www.cpo.by. УНП 193089647
Контактная информация: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42; auction@cpo.by

Общество с ограниченной ответственностью «ВЕНТРЕСУРС» сообщает о проведении **26.12.2018 г.** торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества должника: фальцпрокатная машинка КМ-2,0км-2,0к вк стоимостью 2 683,57 бел. руб., подробную информацию можно узнать на сайте bankrot.gov.by. УНП 691893812